# САФІЯ АЛЯКСЕЕЎНА ЛЫСЕНКА



Споўнілася 75 год чалавеку незвычайнага, яркага лёсу, удзельніцы Вялікай Айчыннай вайны, доктару філалагічных навук, прафесару кафедры рускай літаратуры Сафіі Аляксееўне Лысенка.

Сафія Аляксееўна нарадзілася на Украіне, у вёсцы Валява Кіеўскай вобласці, у сям'і ляснічага. Дзіцячыя і юнацкія гады яе прайшлі ў Кіеве, дзе яна скончыла сярэднюю школу і паступіла на філалагічны факультэт Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта імя Т.Р.Шаўчэнкі. У той жа час паспяхова скончыла двухгадовую медыцынскую школу.

У першы дзень Вялікай Айчыннай вайны з чацвёртага курса універсітэта С.А.Лысенка пайшла добраахвотніцаю ў студэнцкі знішчальны атрад. Пасля яго гібелі студэнты, якія засталіся ў жывых, разам з часцямі Чырвонай Арміі адступілі ў лубенскія лясы (г.Лубны). С.А.Лысенка атрымала накіраванне ў шпіталь №3354, працавала медсястрой. Пасля акупацыі Украіны са шпіталём трапіла ў г.Бійск Алтайскага краю, а затым у Іркуцк. Сафія Аляксееўна ізноў прасіла ваенкамат адправіць яе на фронт. Але атрымала загад адпраўляцца не на Захад, а на Усход – у 116 асобны зенітны артылерыйскі дывізіён Трэцяга брыгаднага раёна Забайкальскага фронту. Служыла дальнамершчыцаю на батарэі, потым камсоргам 166-га дывізіёна. Дэмабілізавалася ў 1945 г. Працавала настаўніцай, дырэктарам школы ў Чыце, а пазней – інспектарам райана ў Хабараўску. У 1950 г. С.А.Лысенка скончыла Львоўскі дзяржаўны універсітэт і на працягу шасці гадоў была настаўніцай сярэдняй школы №28 у Мінску.

З 1956 г. С.А.Лысенка ў Беларускім дзяржаўным універсітэце: выкладчык, старшы выкладчык, кандыдат філалагічных навук (1958), дацэнт, доктар філалагічных навук (1990), прафесар.

Шмат гадоў Сафія Аляксееўна чытае вядучыя курсы і спецкурсы па рускай літаратуры XX ст. Галоўны кірунак яе навуковага пошуку – драматургія XX ст. і рускі гістарычны раман. Ёю надрукавана звыш 100 навуковых прац, сярод якіх выдзяляюцца манаграфіі "Рамантыка барацьбы і тварэння" ("Романтика борьбы и созидания"), "Аб некаторых тэарэтычных перадумовах вывучэння гратэску" ("О некоторых теоретических предпосылках изучения гротеска").

Больш за сорак год працы ва універсітэце С.А.Лысенка выхавала сотні спецыялістаў-філолагаў, у тым ліку і кандыдатаў навук. Баявыя і працоўныя заслугі Сафіі Аляксееўны адзначаны высокімі ўзнагародамі: Ордэнам Вялікай Айчыннай вайны, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, медалямі "За перамогу над Германіяй", "За доблесную працу", "Ветэран працы", мангольскім медалём "За перамогу над Японіяй", "Ганаровым знакам Украіны" да 50-годдзя вызвалення рэспублікі.

Калегі, сябры і студэнты сардэчна віншуюць Сафію Аляксееўну са слынным сямідзесяціпяцігоддзем і шчыра зычаць ёй моцнага здароўя, творчага натхнення, шчасця ў яе гасцінным доме.